УДК 378.147

*А. М. Шубадзёрава*
*дацэнт кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін*
*Магілёўскага інстытута МУС,*
*кандыдат філалагічных навук, дацэнт (Беларусь)*

# ДОСЛЕДНА-ТВОРЧЫЯ ВІДЫ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ ЯК СРОДАК ФАРМІРАВАННЯ КАМУНІКАТЫЎНАЙ КАМПЕТЭНЦЫІ НАВУЧЭНЦАЎ

*У артыкуле падрабязна аналізуюцца мэты, формы і функцыі самастойнай работы студэнтаў, разглядаюцца адметнасці выкарыстання ў вучэбным працэсе дседна-творчых відаў самастойнай работы. Асаблівы акцэнт робіцца на такіх формах, як эсэ і партфоліа, аналізуюцца іх тыпы, структура і функцыі. Вызначаецца актуальнасць падобнага віду творчай работы ў працэсе падрыхтоўкі студэнтаў праваахоўных спецыяльнасцей.*

***A. M. Shubadziorava***

***Experimental and creative types of independent work as a means of forming students' communicative competence***

*The article analyzes in detail the goals, forms and functions of independent work of students, discusses the features of using experimental and creative types of independent work in the educational process. Special emphasis is placed on such forms as essays and portfolios, their types, structure and functions are analyzed. The relevance of this type of creative work in the process of training students of law enforcement specialties is determined.*

У вышэйшых навучальных установах самастойная работа прадугледжваецца пры вывучэнні кожнай дысцыпліны і арганізуецца з улікам канкрэтных патрабаванняў адукацыйных стандартаў, узроўню падрыхтоўкі студэнтаў і іх інтэлектуальных здольнасцей, узроставых магчымасцей. Безумоўна, студэнты-першакурснікі маюць асабісты вопыт арганізацыі самастойнай работы, які яны атрымалі ў школе, ва ўстановах дадатковай адукацыі, дома. Аднак пры навучанні ў ВНУ патрабаванні да самастойнай работы ўскладняюцца, бо звязаны з фарміраваннем агульнакультурных і прафесійных кампетэнцый.

Самастойная работа прызначана актывізаваць вучэбна-пазнавальную дзейнасць навучэнцаў, пашырыць вучэбную інфармацыю, атрыманую на практычных занятках, сфарміраваць у іх уменні самастойнага набыцця і абагульнення лінгвакультуралагічных ведаў, развіць навыкі самаарганізацыі, самастойнасці мыслення, здольнасці да самаразвіцця, самаўдасканалення, самарэалізацыі.

Звычайна самастойную работу студэнтаў па любой дысцыпліне падзяляюць на дзве часткі:

– самастойная работа, якую навучэнец выконвае без непасрэднага кантролю з боку выкладчыка (яна, як правіла, арганізуецца самім студэнтам у зручны для яго неаўдыторны час, вызначаецца ўласнымі пазнавальнымі патрэбамі);

– кіруемая самастойная работа, арганізаваная выкладчыкам і прапісаная ў навукова-метадычнай дакументацыі (студэнт самастойна выконвае заданні, выдадзеныя выкладчыкам, у спецыяльна адведзены час). Кіруемая самастойная работа кантралюецца, можа быць арганізавана з дапамогай камп'ютарных тэхналогій. Могуць выкарыстоўвацца розныя формы кіруемай самастойнай работы: аўдыторная і неаўдыторная, групавая і індывідуальная.

Кіруемая самастойная работа студэнтаў пры вывучэнні дысцыплін філалагічнага профілю прадугледжваецца вучэбнай праграмай і мае навукова-метадычнае забеспячэнне: электронны вучэбна-метадычны комплекс, вучэбную праграму і метадычныя рэкамендацыі па дысцыпліне, навукова-метадычную і даведкавую літаратуру, электронныя сродкі навучання і інш. Выбар форм і відаў арганізацыі кіруемай самастойнай работы вызначаецца зместам вучэбнай дысцыпліны і формай арганізацыі навучання (лекцыя, семінар, практычныя заняткі, кантрольныя мерапрыемствы і інш.), а таксама ўзроўнем падрыхтоўкі студэнтаў.

Пры вывучэнні філалагічных дысцыплін выкарыстоўваюцца розныя віды кіруемай самастойнай работы студэнтаў: а) рэпрадукцыйны, б) рэканструкцыйны (прадукцыйны), в) даследна-творчы.

Асаблівую ўвагу хацелася б звярнуць на даследна-творчыя віды самастойнай работы, паколькі яны фарміруюць кампетэнцыі на ўзроўні прымянення атрыманых ведаў. Пры выкананні заданняў такога тыпу адбываецца абагульненне і сістэматызацыя лінгвістычных ведаў, перанос іх у нестандартныя ўмовы. Творчая самастойная работа патрабуе аналізу праблемнай сітуацыі і атрымання новай інфармацыі. Валоданне мовай, навыкамі пісьма і ўменне прадставіць тэкст — гэта асноўныя якасці такіх работ.

Не выклікае сумнення той факт, што камунікатыўная кампетэнтнасць з'яўляецца вельмі істотнай для прадстаўнікоў праваахоўных спецыяльнасцей, паколькі мова — важны прафесійны складнік праваабаронцаў. Ім даводзіцца мець зносіны з прадстаўнікамі самых розных прафесій і сацыяльных пластоў, тлумачыць грамадзянам прававыя нормы, афармляць дакументацыю (дагаворы, пратаколы і іншыя судовыя паперы), весці дзелавую перапіску, выступаць у ролі аратара і прапагандыста прававых ведаў. Усе гэтыя функцыі рэалізуюцца з дапамогай мовы.

Для фарміравання і развіцця моўнай кампетэнцыі навучэнца вельмі прадуктыўным відам доследна-творчай самастойнай работы з'уляецца эсэ, якое садзейнічае развіццю і ўдасканаленню навыкаў самастойнага творчага мыслення і пісьмовага выкладу ўласных думак.

Эсэ як від самастойнай работы здаўна выкарыстоўваецца ў вучэбным працэсе пры вывучэнні розных дысцыплін і падрабязна апісаны ў навукова-метадычнай літаратуры [1; 2; 3]. Неабходна нагадаць, што эсэ мае свае адметныя рысы: невялікі аб'ём, які не прадугледжвае ўсебаковага і вычарпальнага асвятлення тэмы; адлюстраванне ўласнага пункту гледжання навучэнца па тым ці іншым пытанні, якое ён павінен абавязкова аргументаваць, абапіраючыся на свой жыццёвы вопыт [2, с. 64].

Для доказу ўласнай пазіцыі могуць выкарыстоўвацца выказванні вядомых людзей, гістарычныя факты, навуковыя і статыстычныя даныя, афіцыйныя дакументы, прыклады з мастацкай літаратуры і інш.

Эсэ павінна складацца з трох частак: ва ўступе называецца галоўная тэма разважання, абгрунтоўваецца яе актуальнасць; асноўная частка дае адказ на пастаўленае пытанне або вызначае шляхі вырашэння той або іншай праблемы, менавіта ў гэтай частцы прыводзяцца доказы, ілюстрацыйны матэрыял або прыклады з асабістага жыцця аўтара; у заключэнні робяцца высновы з усяго сказанага, фармулююцца вывады. Эсэ, як правіла, павінна быць напісана ў публіцыстычным ці навукова-папулярным стылі.

У навукова-метадычнай літаратуры апісаны розныя падыходы да класіфікацыі эсэ [1; 2; 3]. Спынімся на найбольш ужывальных. Паводле зместу эсэ падзяляюцца на філасофскія, гістарычныя, мастацкія, мастацка-публіцыстычныя, літаратурна-крытычныя, духоўна-рэлігійныя і інш. Па літаратурнай форме эсэ дзеляцца на лірычныя мініяцюры, старонкі з дзённіка, лісты, нататкі, рэцэнзіі і інш. Па спосабе выкладу, па кампазіцыйных асаблівасцях эсэ бываюць апісальныя, апавядальныя, параўнальныя, ілюстрацыйныя, прычынна-выніковыя, аналітычныя, крытычныя, аргументацыйныя, класіфікацыйныя і інш.

Акрамя гэтага, прапануецца класіфікацыя, згодна з якой эсэ падзяляецца на дзве вялікія групы: 1) суб'ектыўнае эсэ, дзе асноўным элементам з'яўляецца раскрыццё таго ці іншага боку аўтарскай асобы, 2) эсэ аб'ектыўнае, дзе асабасны пачатак падпарадкаваны прадмету апісання ці нейкай ідэі. Відавочна, што эсэ навучэнца на пэўную тэму належыць да другой групы.

Выбар таго ці іншага тыпу эсэ залежыць ад профілю і этапу (першы або выпускны курс) навучання студэнта, ад узроўню яго агульнай і моўнай падрыхтоўкі, ад навучальных задач, якія вырашаюцца выкладчыкам, ад выбару самаго навучэнца. Ад студэнта патрабуецца мець сваю пазіцыю, здолець даказаць свой

пункт погляду, умець ясна і пісьменна выкладаць свае думкі, аргументуючы і ілюструючы іх дастатковай колькасцю прыкладаў.

Для навучэнцаў праваахоўных спецыяльнасцей найбольш прыдатнымі будуць эсэ з улікам спосабу выкладу і кампазіцыйных асаблівасцей, напрыклад, апавядальнае эсэ (аўтар не толькі расказвае пра падзеі ці факты ў пэўнай паслядоўнасці, але і выказвае сваё меркаванне, гаворыць пра свае пачуцці); апісальнае (паказвае накірунак або прапануе план выканання той ці іншай задачы); прычынна-выніковае (фіксуе ўвагу на перадумовах і наступствах вырашэння доследнай праблемы); параўнальнае (паказвае адрозненні і (або) падабенствы паміж пазіцыямі, ідэямі, падыходамі і г. д.); аргументацыйнае (утрымлівае абгрунтаванае меркаванне адносна прадмета вывучэння).

Асобна трэба сказаць пра тэмы эсэ. Яны павінны быць дыскусійнымі, гэта значыць прадугледжваць розныя падыходы да іх раскрыцця. Акрамя таго, тэмы могуць утрымліваць у сабе пытанне, праблему. Галоўнае, яны павінны заахвочваць навучэнцаў паразважаць над сітуацыяй, выказаць свае меркаванні, абгрунтаваць уласную пазіцыю. Напрыклад, для студэнтаў праваахоўных спецыяльнасцей можна прапанаваць наступныя тэмы для напісання эсэ: «Ці можа супрацоўнік праваахоўных органаў выкарыстоўваць у маўленні жаргон?», «Сям'я ці кар'ера: што важней?», «Ці існуе мода на прафесіі?», «Праблема выкарыстання ў маўленні запазычаных слоў». У якасці тэмы для эсэ могуць выступаць афарызмы або кароткія цытаты: «Бывае слава, як праклён» (Васіль Зуёнак), «Спакойнага шчасця не зычу нікому…» (Аркадзь Куляшоў) і інш.

Безумоўна, эсэ — дзейсны і прадуктыўны від самастойнай доследна-творчай работы, бо, працуючы над эсэ, студэнт вучыцца пісьмова выказваць і фармуляваць уласныя думкі, даказваць свой пункт гледжання, аналізаваць інфармацыю, прыводзіць у якасці доказаў прыклады, аргументаваць, дэманстраваць навыкі пісьмовага маўлення. Аднак дадзены від работы з'яўляецца карысным і эфектыўным толькі ў тым выпадку, калі эсэ выконваецца самастойна, калі яно цалкам «не запазычана» з інтэрнэту або не скампелявана з іншых тэматычна падобных работ.

У якасці альтэрнатывы традыцыйнаму эсэ можа разглядацца і такая форма самастойнай доследна-творчай работы, як партфоліа [4; 5]. У найбольш агульным разуменні вучэбнае партфоліа ўяўляе сабой форму і працэс арганізацыі (калекцыя, адбор і аналіз) узораў і прадуктаў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці навучэнца, а таксама адпаведных інфармацыйных матэрыялаў са знешніх крыніц, прызначаных для наступнага іх аналізу, усебаковай колькаснай і якаснай ацэнкі ўзроўню падрыхтаванасці студэнта і далейшай карэкцыі працэсу навучання.

Да асноўных тыпаў партфоліа адносяць:

1. Папка дасягненняў, якая адлюстроўвае яго вучэбныя, доследныя і творчыя поспехі. Такое партфоліа прад'яўляецца як вынік засваення вучэбнай дысцыпліны, а выніковае партфоліа за ўсе гады навучання – як кваліфікацыйны вынік творчага і навуковага развіцця на дзяржаўным экзамене па спецыяльнасці.

2. Рэфлексійнае партфоліа раскрывае дынаміку развіцця студэнта, дапамагае прасачыць выніковасць яго дзейнасці як у колькасным, так і якасным планах. У гэтую папку збіраюцца ўсе кантрольныя і творчыя працы: публікацыі, эсэ, рэфераты, заліковыя і курсавыя работы на працягу пэўнага тэрміну. Такое партфоліа дазваляе аб'ектыўна ацаніць навукова- доследны патэнцыял выпускной кваліфікацыйнай работы.

3. Праблемна-доследнае партфоліа ўключае ў сябе матэрыялы, неабходныя для розных этапаў доследнай дзейнасці, ад пастаноўкі праблемы да яе рашэння, уключаючы матэрыялы пошуку, матэрыялы, патрэбныя для напісання рэферата, навукова-доследнай работы, падрыхтоўкі да выступлення на канферэнцыі, прэзентацыі, эсэ і інш.

4. Тэматычнае партфоліа, якое ствараецца ў працэсе вывучэння якой-небудзь вялікай тэмы, раздзела, вучэбнага курса.

Для навучэнцаў праваахоўных спецыяльнасцей найбольш эфектыўным з'яўляюцца праблемна-доследнае і тэматычнае партфоліа. Звычайна такія партфоліа могуць уключаць: кароткі аналіз некалькіх літаратурных крыніц, бібліяграфічную інфармацыю, вынікі праведзенага апытвання ці анкетавання, інфармацыю, якая дэманструе набыты тэарэтычны ці практычны вопыт навучэнца і інш. Усе гэтыя матэрыялы могуць быць выкарыстаны для падрыхтоўкі эсэ, дакладаў, паведамленняў, публікацый, прэзентацый і інш. Партфоліа могуць быць аформлены як на паперы, так і ў электронным выглядзе. Паколькі адсутнічае адзіны спосаб пабудовы партфоліа, то студэнты павінны арыентавацца на абавязковую прысутнасць у працэсе яго стварэння трох складнікаў: збору інфармацыі, адбору і яе апрацоўкі, разваг над праблемным матэрыялам.

У працэсе навучання партфоліа можа выкарыстоўвацца як:

1. Асобныя заняткі — абарона партфоліа. Яны праводзяцца ў канцы навучальнага курса і могуць лічыцца формай для выстаўлення выніковай ацэнкі па асобнай дысцыпліне.

2. Семінар з выкарыстаннем элементаў партфоліа. Прэзентацыя і непрацяглае абмеркаванне партфоліа.

Выкарыстанне моўнага партфоліа ў навучальным працэсе спрыяе развіццю ў студэнтаў навыкаў працы з рознымі відамі вучэбнай і прафесійнай

інфармацыі, а таксама фарміраванню прафесійных і камунікатыўных кампетэнцый.

Такім чынам, доследна-творчыя віды самастойнай работы прызначаны для таго, каб навучыць студэнта абагульняць вывучаны матэрыял, рабіць высновы і выкладаць свае думкі вусна і на паперы. Для будучых праваахоўнікаў, кіраўнікоў, арганізатараў для росту прафесіяналізму неабходна, у першую чаргу, умець добра прэзентаваць свае ідэі.


1. Заварзина Л. Э. Эссе как вид самостоятельной работы студентов при изучении курса «История образования и педагогической мысли» // Историко-педагог. журн. 2018. № 1. С. 64–81. Вернуться к статье
2. Кузнецова Е. В. Эссе как компонент письменной речи при обучении иностранному языку студентов старших курсов // Профессиональное лингвообразование : материалы Восьмой Междунар. науч.-практ. конф., июль 2014 года / Нижегород. ин-т управления — филиал Рос. акад. нар. хозяйства и гос. службы; [редкол.: Н. Л. Уварова, Т. Г. Рыбалко]. Н. Новгород, 2014. С. 288–291. Вернуться к статье
3. Филимонова Н. Ю., Серегина О. Л. Формирование навыка письменной речи с помощью эссе при обучении иностранному языку // Актуальные вопросы профессионального образования. 2018. № 3 (12). С. 18–22. Вернуться к статье
4. Наумова Т. А. Метод портфолио как вид самостоятельной работы студентов // European science. 2016. № 8 (18). С. 41–44. Вернуться к статье
5. Ретивых М. В. «Портфолио» как комплексная технология организации самостоятельной работы студентов // Вестн. Брян. гос. ун-та. 2014. № 1. С. 186–192. Вернуться к статье